## Нашы віншаванні

***Штогод традыцыйна ў святочныя дні Нараджэння Хрыстовага адбываецца ўзнагароджванне лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне».***

Сёлета сярод узнагароджаных Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь за ўвасабленне нацыянальна-гістарычнай тэматыкі ў балеце «Вітаўт». У ліку ўзнагароджаных спецыяльнай прэміяй – аўтарскі калектыў у складзе супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алены Боганевай і Тамары Варфаламеевай, педагога Цэнтра дадатковай адукацыі «Ветразь» Кастрычніцкага раёна г. Мінска Мікалая Козенкі. Удастоены ўзнагароды таксама аўтарскі калектыў у складзе дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Людмілы Дамнянковай, дырэктара творча-эксперыментальнага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Гударт» Пятра Лабковіча, супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Барыса Лазукі. Прэміі ўдастоены калектыў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Сярод узнагароджаных – калектыў творчых майстэрняў «Цэнтра сучасных мастацтваў», калектыў Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна.

*Паводле афіцыйнай інфармацыі*



*Т. Варфаламеева, А. Боганева, М. Козенка*

***Беларускі фонд культуры і «Краязнаўчая газета» шчыра радыя, што сярод тых, чыя руплівая праца па захаванні і папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны заўважаная і высока адзначаная, ёсць і нашыя сталыя сябры ды аўтары. Віншуем спн. Варфаламееву, Боганеву і сп. Козенку з узнагародаю і зычым ім новых творчых поспехаў!***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ